*А.А. ПАПЕЙКА*

# АДЛЮСТРАВАННЕ АСАЦЫЯТЫЎНЫХ СУВЯЗЕЙ НЕКАТОРЫХ НАЗВАЎ АСОБ

Традыцыйна лічыцца, што псіхафізіялагічнай асновай асацыяцыі з'яўляецца часовая нервовая сувязь, якая ўзнікае паміж рознымі ўчасткамі кары вялікіх паўшар'яў галаўнога мозгу; гэтая сувязь узнікае як суб'ектыўная рэакцыя на нейкі знешні раздражняльнік. У псіхалінгвістычным эксперыменце

ив библиотеки МГУ имен

на свабоднае асацыіраванне такім знешнім раздражняльнікам з'яўляецца зыходнае слова-стымул, рэакцыя на якое таксама ўяўляе сабой вербальную адзінку (слова). Улічваючы той факт, што паміж стымулам і рэакцыяй існуе пэўная сувязь, а таксама тое, што і стымул, і рэакцыя прадстаўлены вербальнымі адзінкамі, мы можам зрабіць выснову: лексічнае багацце мовы захоўваецца ў мазгу чалавека ў выглядзе пэўным чынам арганізаванай сістэмы; пры гэтым некаторыя сувязі паміж часткамі гэтай сістэмы праяўляюцца ў выніку асацыятыўнага эксперыменту.

Звернем увагу на спецыфіку пабудовы асацыятыўных палёў некаторых слоў семантычнай групы «чалавек, асоба», якая ў нашым эксперыменце была прадстаўлена наступнымі стымуламі: *асоба, брат, грамадзянін, дзіця, дзяўчынка, доктар, жанчына, жонка, злачынца, кароль, муж, мужчына, поп, сям'я, салдат, хлопчык, чалавек, я, мы.* У кожным выпадку будуць разглядацца адказы пяцісот інфармантаў; адказы, якія на адзін і той жа стымул сустракаліся пяць і больш разоў, будуць называцца ўстойлівымі асацыяцыямі.

Адзначым, што ўсе ўстойлівыя асацыяцыі на пералічаныя стымулы размяркоўваюцца паміж двума дзесяткамі асноўных напрамкаў асацыіравання, якія былі вызначаны намі ў выніку эксперыменту: чалавек, асоба, жывёла, пол (розны), узрост, якасць (характарыстыка), памер, прыналежнасць, атрыбутыка, месца, дзеянні, адносіны (і пачуцці), стан (і самаадчуванне), сацыяльная (і сямейная) роля, ступень роднасці, грамадства, права, прафесія, іншыя асобы (і акружэнне), наяўнасць/адсутнасць. Рэмінісцэнтныя асацыяцыі на акрэсленую групу стымулаў звычайна сустракаюцца ў такіх напрамках, як «чалавек», «асоба», «жывёла», «дзеянні»: чалавек – *ідзе*; доктар – *Айбаліт*; кароль – *голы, леў, казка*; хлопчык – *лётчык*, але ў большасці выпадкаў не перабольшваюць 2 – 5% агульнай колькасці адказаў (так, названыя асацыяцыі сустрэліся ў такой колькасці адказаў: *ідзе* – 17; *Айбаліт* – 11; *леў* – 14; *голы, казка* – 7; *лётчык* – 19).

Як паказаў эксперымент, стымулы-назоўнікі семантычнай групы «чалавек» выклікаюць у інфармантаў у сярэднім 120 – 125 розных адказаў, з якіх 16 – 18 адносяцца да ўстойлівых асацыяцый (6 – 7 асноўных напрамкаў рэагавання); яны складаюць прыкладна 70% агульнай колькасці адказаў, прычым парадыгматычныя асацыяцыі сустракаюцца прыкладна ў чатыры разы часцей за сінтагматычныя.

Знамянальна, што асацыяцыяй, якая ўзнікала як устойлівая практычна на ўсе стымулы, з'яўляецца *чалавек*. Так, на стымулы *асоба, грамадзянін, мы, я* дадзеная асацыяцыя наогул з'яўляецца самай частай і займае да 30% (на стымул *асоба*) сукупнасці адказаў. Цікава, што слова «чалавек», якое дало назву ўсёй сэнсавай групе, у якасці стымула выклікала найбольшую колькасць (у межах гэтай групы) розных адказаў, а менавіта – 166. Пэўна, гэта сведчыць аб тым, што дадзены стымул у параўнанні з іншымі, названымі ў пачатку работы, валодае найбольш шырокімі магчымасцямі ў набыцці таго ці іншага канкрэтнага значэння; адсюль вынікае, што ён мае найбольш шырокае значэнне, з'яўляецца цэнтральным у азначанай групе стымулаў. У той жа час устойлівыя асацыяцыі (на стымул *чалавек* іх было налічана 19) займаюць адносна не надта вялікую частку агульнай колькасці адказаў (каля 62%) і ўтвараюць наступную асацыятыўную структуру: «якасці»: 68 – *добры*; 12 – *разумны*; 9 – *злы*; 7 – *вялікі, прыгожы*; «асобны чалавек»: 43 – *асоба*; 25 – *я*; 18 – *істота* (у т.л. 2 – *жывая істота*); «чалавек у грамадстве»: 19 – *грамадзянін, людзі*; 9 – *грамадства*; «стан (жыццё)»: 15 – *жыццё*; 10 – *жыць* (у т.л. 3 – *жыве*); «жывёла»: 10 – *жывёла* (у т.л. 1 – *жывёліна*); 5 – *звер*; «дзеянні»: 17 – *ідзе* (у т.л. 2 – *ісці*); «спецыфічныя ўласцівасці»: 7 – *розум*; 5 – *душа*; «пол»: 7 – *мужчына*.

Наогул, з пункту гледжання падабенства асацыятыўных структур (і тоеснасці найбольш частых асацыяцый) у межах прызначанай для аналізу семантычнай групы можна вылучыць некалькі перакрыжаваных груп стыму-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

лаў. Першую (якая ўжо называлася) складаюць стымулы *асоба, грамадзянін, мы, я*; для дадзеных слоў характэрна тое, што вельмі значная частка інфармантаў збліжае іх са словам *чалавек*. Так, колькасць адказаў *чалавек* на стымулы складае: *асоба* – 150; *грамадзянін* – 105; *я* – 123; на стымул *мы* больш за 80 інфармантаў далі асацыяцыю *людзі*. У сваю чаргу, стымулы *грамадзянін, чалавек, я* аб'ядноўваюцца частай асацыяцыяй *асоба*: *грамадзянін* – 9; *чалавек* – 43; *я* – 39. Цікава, што абодва займеннікі, скарыстаныя намі ў якасці стымулаў, увайшлі менавіта ў гэтую групу; уводзіліся ж яны ў слоўнік нашага эксперыменту з мэтай высвятлення заканамернасцей сэнсавай напаўняльнасці займеннікаў.

У другую групу ўваходзяць стымулы з агульнай семантыкай «прафесія, род заняткаў»: *злачынца, доктар, кароль, поп, салдат*. Фармальна па канкрэтных асацыяцыях яны значна адрозніваюцца адзін ад аднаго, але аб'ядноўваюцца на той падставе, што пераважная большасць адказаў на дадзеныя стымулы адносіцца да напрамкаў рэагавання «атрыбутыка, дзеянні, характэрнае месцазнаходжанне». Так, на стымул *доктар* найбольш устойлівымі асацыяцыямі інфармантаў аказаліся: *хвароба, бальніца, лекі, халат, лячыць, боль, шпрыц, укол, таблеткі*; на стымул *поп* – *царква, крыж, раса, крэст, барада, рыза, кадзіла, маліцца*; на стымул *салдат* – *армія, вайна, шынель, форма, служыць, аўтамат, ружжо, зброя, пагоны, боты, служба*. Дарэчы, адказы з семантыкай атрыбутыкі і дзеянняў сустракаліся і на іншыя стымулы: *дзіця – калыска, плач, плача, пялёнкі, крык, соска, цацка, люлька*; *дзяўчынка – бант, банцік, сукенка, каса, хустка, кветка*; *хлопчык – машынка, мяч, шорты*, але ўдзельная вага асацыяцый з названай семантыкай у дадзеным выпадку значна менш (так, напрамак рэагавання «атрыбутыка» для стымула *хлопчык* складае каля 4 % усіх асацыяцый, а для стымула *поп* – каля 60 %).

Наступную групу ўтвараюць словы *жанчына, жонка, мужчына, муж*. Структура асацыятыўных палёў дадзеных стымулаў адзначаецца некаторай паралельнасцю: асноўныя напрамкі рэагавання ў парах *жанчына – жонка* і *мужчына – муж* амаль супадаюць, але стымулы *жонка* і *муж* маюць адносна больш вялікую накіраванасць на напрамак «сям'я, шлюбны партнёр», чым стымулы *жанчына* і *мужчына*, у той жа час менш увагі інфарманты звяртаюць на характэрныя палавыя якасці (асацыяцыя *прыгожая* на стымул жанчына сустракаецца амаль у 3 разы часцей, чым на стымул *жонка*; у той жа час асацыяцыя *сям'я* – каля 3% усіх адказаў на стымул *жонка* і 4% на стымул *муж* – сярод устойлівых на стымулы *жанчына* і *мужчына* наогул не сустракалася). Да гэтай групы стымулаў далучаюцца словы *хлопчык – дзяўчынка*, асацыяцыі на якія ў некаторай ступені адпавядаюць асацыяцыям на словы *мужчына – жанчына*, ствараючы асноўныя напрамкі асацыіравання «чалавек», «якасці», «пол (розны)», «атрыбуты», «сямейная роля»; аднак склад групы атрыбутаў пары *хлопчык – дзяўчынка* мае істотныя адрозненні ад асацыяцый на астатнія стымулы: праз атрыбутыку падкрэсліваюцца характэрныя ўласцівасці дзяцінства (*хлопчык – машынка, мяч, шорты*; *дзяўчынка – бант, сукенка, каса, хустка, кветка*).

Адзначым таксама факт узаемнага (люстранага) асацыіравання паміж стымуламі – назвамі асоб. Так, мы можам вылучыць 12 наступных пар люстраных асацыяцый: *жонка – жанчына* (на стымул *жонка* – 55 адказаў *жанчына*; на стымул *жанчына* – 13 адказаў *жонка*), *жонка – муж* (94/163), *мужчына – жанчына* (125/46), *мужчына – муж* (21/30), *хлопчык – брат* (10/7), *хлопчык – дзяўчынка* (69/47), *чалавек – асоба* (43/150), *чалавек – грамадзянін* (19/105), *чалавек – мужчына* (7/32), *чалавек – я* (25/123), *я – асоба* (39/103), *я – мы* (19/19). Падобныя люстраныя асацыяцыі цікавыя тым, што даюць магчымасць не толькі атрымаць уяўленне пра пабудову асацыятыўнай структуры пэўнай часткі лексічнага матэрыялу, але і прасачыць ступень узаемнага ўваходжання слоў у семантычныя палі, што дазваляе



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

разглядаць словы з боку гледжання «сэнсавай падпарадкаванасці». Так, Ю.Д.Апрэсян прапанаваў методыку вызначэння ступені ўваходжання слова ў семантычныя палі ў залежнасці ад таго, у якія семантычныя палі ўваходзяць асацыяцыі на стымул[1]. Мера ўваходжання слова А ў семантычнае поле слова В вызначаецца па формуле $\mathbf{M_{AB}=(n_B-1)/N}$, дзе $n_B$ – колькасць рэакцый В на слова А, а N – колькасць удзельнікаў эксперыменту.

Праілюструем гэта на прыкладзе адной з пар узаемных асацыяцый, узяўшы стымулы *чалавек* і *грамадзянін*. Падставіўшы лічбы ў названую формулу, мы атрымаем для слова «чалавек» велічыню ступені ўваходжання ў семантычнае поле слова «грамадзянін»: М=(19–1)/500=0,036; для слова «грамадзянін» ступень уваходжання ў семантычнае поле слова «чалавек»: М=(105–1)/500=0,208. Як бачым, прыкладанне дадзенай методыкі ў гэтым выпадку дазваляе зрабіць выснову: у адносінах пары *чалавек – грамадзянін* вядучая роля належыць слову *чалавек*, бо ступень уваходжання слова *грамадзянін* у семантычнае поле парнага стымула на парадак вышэй за ступень уваходжання слова *чалавек* (дарэчы, слова *чалавек* у параўнанні са словам *грамадзянін* мае больш шырокае асацыятыўнае поле: стымул *грамадзянін* выклікаў 88 розных адказаў, а стымул *чалавек* – 166).

[1] Гл.:Апресян Ю.Д. Современные методы изучения значений и некоторые проблемы структурной лингвистики // Проблемы структурной лингвистики. М., 1963.С. 130.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова